75 мірных гадоў. Беларусь памятае!

# МЕМАРЫЯЛ У ГОНАР ЗЕМЛЯКОЎ

**Зарэчча ўнікальнае ўжо тым, што гэтая маленькая вёсачка, якая паступова і няўмольна знікае з прычыны паважанага ўзросту сваіх жыхароў, раптам стала вёскай-мемарыялам. За нейкія пару гадоў тутэйшыя выхадцы-энтузіясты стварылі памятны комплекс у гонар землякоў — удзельнікаў вайны. Зусім нядаўна ўвайшла ў строй чарговая яго частка — капліца, дзе будуць праводзіцца памінальныя службы.**



**Міхаіл КУЦ *(злева)* і Георгій ШВЕД.**

## Фотаздымкі старога стэнда

Але пра ўсё па парадку. Самая маладая жыхарка Зарэчча Таісія Аляксандраўна Субота адзначыла 79-ы дзень нараджэння. Яна лічыцца старастай вёскі, у якой пастаянна жыве з дзясятак чалавек. Таісія Аляксандраўна вельмі ганарыцца тым, што ў іх з'явілася такое памятнае месца. Расказвае, як летам была ў доктара ў Пружанах, а назад вярталася на таксі: «Дык гэтаму хлопцу-кіроўцу сказала, каб далей праехаў, развярнуўся каля нашай галоўнай алеі — усё для таго, каб і ён убачыў яе. Таксіст так і зрабіў, і ўсе так робяць, хто сюды прыязджае. Тут нашы землякі на партрэтах, маладыя, прыгожыя».

Усяго з невялічкай пружанскай вёскі на вайну пайшлі 59 мужчын, 27 не вярнуліся. Цяпер іх партрэты ўтварылі галоўную мемарыяльную алею... А тыя, каму пашчасціла вярнуцца, у асноўным працавалі ў калгасе. У гаспадарцы і загінулых франтавікоў, і жывых удзельнікаў вайны заўсёды шанавалі. У свой час калгасны парторг сабраў па хатах фотаздымкі ўдзельнікаў вайны і размясціў іх на стэндзе пад назвай «Вечная слава героям».

Стэнд доўгі час вісеў у «чырвоным кутку» калгаснага двара, дзе збіраліся па святах. А потым многае змянілася, пачалася рэарганізацыя, былы калгасны двор прыйшоў у заняпад, фермы сталі закрываць, пабудовы — зносіць. Аднойчы выхадзец з гэтай вёскі Георгій Швед выпадкова зайшоў у былы «чырвоны куток» і жахнуўся. Стэнд валяўся на падлозе, па ім хадзілі. Георгій Яраслававіч забраў тыя здымкі дадому. З гэтага і пачаўся невялікі музей, які ён абсталяваў у бацькоўскім доме.

Неаднойчы прыкідваў, як лепш увекавечыць памяць землякоў. На адным са свят вёскі падзяліўся сваімі думкамі з аднавяскоўцам Міхаілам Куцам.

## Ад ідэі да бізнес-плана

— Мне тады яго словы адразу ў душу запалі, — кажа Міхаіл Міхайлавіч. — Я стаў меркаваць, раіцца з калегамі, сямейнікамі, як зрабіць, каб не знікла памяць пра людзей вёскі. Дзіўная рэч: чым больш жывеш і больш аддаляешся ад родных мясцін, тым болей сюды цягне.

Міхаіл Куц згадаў, як цяжка працавалі яго бацькі. Маці даяркай была, кароў уручную даіла, яму, хлапчуку, даводзілася не раз ёй дапамагаць. Нагледзеўшыся на такі лёс, Міхаіл і яго равеснікі імкнуліся хутчэй пакінуць вёску. Пасля заканчэння школы паступіў у ваеннае вучылішча, служыў па ўсім былым Саюзе, потым асеў у Брэсце, цяпер мае невялікі бізнес. Бацька Міхаіла Міхайлавіча таксама ваяваў, але, на шчасце, вярнуўся. І бацька жонкі франтавік. Так што для сям'і тэма Вялікай Айчыннай — асаблівая.



**Памятная алея.**

Бацькоў даўно няма, але на дзень вёскі заўсёды стараліся прыязджаць у Зарэчча. А калі аднойчы на свята Георгій Швед выставіў шчыт са здымкамі, якія ён падабраў на калгасным двары і рэстаўрыраваў, то людзі ад іх не адыходзілі. Многія пазнавалі сваіх сваякоў, суседзяў, плакалі, клікалі ўнукаў, паказвалі партрэты. Вось тады Куца нібы ахінула, у галаве ўзнікла карцінка з будучым мемарыялам. Ён і ўзяў на сябе львіную долю будучых расходаў.

## Арка і капліца

Найперш былі выраблены мемарыяльныя дошкі з партрэтамі загінулых землякоў. Іх размясцілі ў выглядзе алеі, у канцы якой усталявалі памятны знак-арку са звонам. Справа ад аркі, як ужо гаварылася, узвялі капліцу. Яе купал, унутранае начынне падрыхтавалі ў Брэсце, а сюды прывезлі гатовыя кампаненты і зманціравалі.

З часам у Зарэччы маюць намер абсталяваць стаянку для машын. Паводле слоў прадпрымальніка, тут яшчэ будзе сквер з дрэвамі, у цэнтры паставяць некалькі сталоў, лаўкі, каб на тое ж свята вёскі можна было ўсім прысесці, пагаманіць, успомніць землякоў.

— На адкрыццё мемарыяла з'ехалася некалькі соцень выхадцаў з Зарэчча. Былі госці не толькі з розных гарадоў Беларусі, але і з краін замежжа, — расказвае **старшыня Вялікасельскага сельскага Савета Таццяна НАВІЦКАЯ.** — Дачка франтавіка Івана Гука Вольга Ішчанка прыехала з Адэсы. Яе бацька загінуў у канцы зімы 1945-га. Волечцы тады быў толькі годзік. Пахаваны недзе ва Усходняй Прусіі. Вольга Ішчанка на адкрыцці сказала: «Пакуль жывая, буду сюды прыязджаць».

— Ну, цяпер па вядомых прычынах не можам дакладна сказаць, будзе летам дзень вёскі ці не, — працягвае кіраўнік мясцовай улады. — Але ж мемарыял мы падтрымліваем у парадку заўсёды, тэрыторыя прыбіраецца. У гэтым дапамагае Таісія Аляксандраўна Субота.

## Каб жыла памяць

...Мы стаялі з Міхаілам Куцам і Георгіем Шведам каля першай мемарыяльнай дошкі на алеі. На ёй — партрэт Мікалая Гука. Пазначаны яго гады жыцця: 1926—1945. Салдат загінуў у студзені, цалкам верагодна, што да сваіх дзевятнаццаці ён не дажыў. Партрэт Мікалая паставілі першы нездарма: ён стаіць цяпер акурат насупраць сваёй хаты, адкуль яго праводзілі на вайну. Прызыву падлягалі юнакі з 18 гадоў. Многія яго равеснікі, юныя, нявопытныя, гінулі першыя. Гэта значыць, не нарадзіліся іх дзеці, засталіся несуцешнымі маці.

Міхаіл Куц кажа: «Вёскі хутка не будзе як населенага пункта, але мы павінны захаваць яе для сябе, сваіх дзяцей, унукаў. Нехта ж і пасля нас абавязкова пройдзе-праедзе, нехта кветку пакладзе на 9 Мая. Пасля нас, спадзяюся, нашчадкі падхопяць эстафету, не забудуць сюды дарогу. Тыя з нас, чые бацькі і дзяды прыйшлі з вайны, у даўгу перад імі, такімі як Мікалай Гук».

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
*Пружанскі раён.*


МС

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| Организатор аукциона | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б |
|---|---|
| Продавец | ЗАО «МВЗ Про», г. Минск, пр-т Партизанский, д. 8, корп. 2/2, пом. 402 |

Предмет аукциона
Месторасположение – г. Минск, пр-т Партизанский, 8

| № п/п лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год изготовления | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 401308 | **Гибкий модуль** (токарно-винторезный станок с ЧПУ 16А20Ф3) | **7 920,00** | 396,00 |
| 2 | 441748 | **Станок плоскошлифовальный 3Г-71** | **4 320,00** | 216,00 |
| 3 | 418127 | **Станок круглошлифовальный 3А151,** 1964 г.в. | **5 760,00** | 288,00 |
| 4 | 442183 | **Обрабатывающий центр ОЦФ-1 с ЧПУ Bosch,** 1993 г.в. | **21 480,00** | 1074,00 |
| 5 | 442184 | **Обрабатывающий центр ОЦФ-1 с ЧПУ Bosch,** 1990 г.в. | **21 480,00** | 1074,00 |
| 6 | 442181 | **Обрабатывающий центр ЦР320 (Бишкек),** 1984 г.в. | **21 480,00** | 1074,00 |
| 7 | 428337 | **Пресс КД2124Е** | **4 800,00** | 240,00 |
| 8 | 428283 | **Пресс КД-2122,** 1978 г.в. | **3 960,00** | 198,00 |
| 9 | 428419 | **Пресс кривошипный КД-2122** | **3 000,00** | 150,00 |
| 10 | 418125 | **Станок внутришлифовальный 3А227,** 1963 г.в. | **6 480,00** | 324,00 |
| 11 | 442495 | **Станок точильно-шлифовальный 3Б-634** | **1 056,00** | 52,80 |
| 12 | 401335 | **Универсальный токарно-винторезный станок 1604,** 1970 г.в. | **624,00** | 31,20 |
| 13 | 443116 | **Пресс гидравлический ДБ243,** 1953 г.в. | **13 320,00** | 666,00 |
| 14 | 770860 | **Прицеп «Купава» 813270** | **4 320,00** | 216,00 |
| 15 | 401174 | **Станок токарно-винторезный 1К-62,** 1966 г.в. | **1 680,00** | 84,00 |
| 16 | 411232 | **Станок вертикально-сверлильный 2Н118** | **1 560,00** | 78,00 |
| 17 | 411253 | **Станок вертикально-сверлильный 2Н118,** 1966 г.в. | **1 560,00** | 78,00 |
| 18 | 411461 | **Станок вертикально-сверлильный 2н135** | **1 800,00** | 90,00 |
| 19 | 411430 | **Станок агрегатно-сверлильный модель А6038П,** 1975 г.в. | **1 800,00** | 90,00 |
| 20 | 411194 | **Станок вертикально-сверлильный 2Н118** | **1 560,00** | 78,00 |
| 21 | 411 03 | **Станок вертикально-сверлильный 2Н118,** 1961 г.в. | **1 560,00** | 78,00 |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 19.00. Ответственное лицо: Короткевич Владимир Александрович, тел. +375 29 608-47-06

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY92 BELB 3012 0048 3500 8022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи:** 5 (пять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** в день подписания договора купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 %

Победитель аукциона, либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 5 (пяти) процентов от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| Дата, место и время проведения аукциона | **25.05.2020 в 13.30 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
|---|---|
| Дата, место и время окончания приема документов | **22.05.2020 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.**
**E-mail: auction@ipmconsult.by**



**КУПЛЮ МОТОБЛОК**
**или Минитрактор МТЗ,**
можно в неисправном состоянии. **Тел. +375 29 666 00 70**



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

www.zviazda.by

**e-mail: info@zviazda.by** (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804.** **Нумар падпісаны ў 19.30 23 красавіка 2020 года.**